основные направления. Реализация этих основ требует большой и постоянной работы над содержанием и методическим обеспечением самостоятельного учения.

1. *Псіхолага-педагагічныя* і метадычныя праблемы актывізацыі самастойнай пазнавальнай работы студэнтаў: матэрыялы навук.-метад. канф. (1–2 лютага 2001г.) / Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры; рэдкал.: А.І. Смолік (адк. рэд.), Р.А. Ровіна, Л.Ц. Спірыдонава. – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2001. – 181с.

2. *Университетское* образование: от эффективного образования к эффективному учению: сб. рефератов статей по дидактике высшей школы / Белорусский государственный университет, Центр проблем развития образования; редкол.: Д.И. Губаревич, Е.Ф. Карпиевич, Л.Г. Кирилюк, И.Е. Осипчик. – Мн.: Пропилеи, 2001. – 156 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Л.К. Валасюк,** *дацэнт*

## ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ У СУЧАСНЫМ МУЗЫЧНЫМ НАВУЧАННІ

(спецінструмент)

Выхаванне навыкаў самастойнай творчай работы ў дачыненні да студэнтаў-інструменталістаў факультэта музычнага мастацтва, якія ў асноўным маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, можна разглядаць як працяг працы, якая пачалася з першых крокаў навучання ігры на інструменце (у 6–10 гадоў), як пераемнасць у навучанні: дзіцячая мастацкая школа – музычнае вучылішча – універсітэт. Вырашэнне гэтай актуальнай праблемы магчыма толькі пры індывідуальным падыходзе да кожнага студэнта і стварэнні адпаведных умоў для самастойных заняткаў, у тым ліку неабходна забяспечыць дастатковыя бюджэт часу, колькасць аўдыторый для самастойных заняткаў, матэрыяльную базу і інш.

Асновай вучэбнага працэсу па спецінструменце з'яўляецца арганічнае спалучэнне і ўзаемасувязь індывідуальных і самастойных заняткаў. Індывідуальныя заняткі маюць вялікае значэнне ў

агульным працэсе фарміравання музыканта, наладжванні рэгулярнай сувязі педагога з вучнем.

Асноўная задача педагога – сфарміраваць музыканта, сучаснага спецыяліста, які ўмее самастойна набываць веды, разумее патрэбнасць для творчай асобы самаарганізацыі і самадысцыпліны.

Кожнае пастаўленае педагогам заданне павінна быць дакладным і ясным, адпавядаць магчымасцям студэнта і дапамагчы яму набыць нейкую новую якасць. Справа педагога – забяспечыць навучэнца не толькі ведамі, але і метадамі работы па іх засваенні, паказаць найбольш простыя і кароткія шляхі працы над музычным творам у цэлым, навучыць творча працаваць. Кожнаму музыканту, які паставіў перад сабой мэту навучыцца добра іграць, неабходна штодзённа ўдасканальваць тэхніку выканання. Вельмі важна арганізаваць штодзённыя самастойныя заняткі па спецінструменце. Тут педагог можа дапамагчы студэнту ў складанні дамашняга раскладу, прыкладнага плана самастойных заняткаў, у чарнавой прапрацоўцы дамашняга задання ў класе, дапамагчы рацыянальна размеркаваць час для работы над інструктыўным матэрыялам, мастацкім творам, дапамагчы ў разборы новых твораў, чытанні нот з ліста і г. д.

Для самастойнай работы вельмі важна выпрацаваць прывычку да штодзённай ігры на інструменце, развучвання твора ў павольным тэмпе (на першым этапе), прапрацоўкі цяжкіх месцаў (як у тэхнічным, так і ў эмацыянальным плане). Вельмі важна ўмець самастойна праставіць аплікатуру, улічваючы сувязь аплікатуры са структурай мелодыі, штрыхамі, залежнасць аплікатуры ад характару гуку, дынамікі, артыкуляцыі, фразіроўкі, тэмпу, прадугледжваць розныя аплікатурныя варыянты, варыянты змены пазіцый, уменне працаваць над гукам, фразіроўкай, дынамікай і г. д.

Самастойная работа над мастацкім творам пачынаецца з уменняў: 1) рабіць аналіз стылістычных асаблівасцей канкрэтнага твора, выяўляць характэрныя асаблівасці творчасці кампазітара; 2) асэнсоўваць музычныя вобразы, адметнасці выканаўчага майстэрства; 3) выяўляць варыянты магчымых інтэрпрэтацый вывучаемага твора (аналіз нотных рэдакцый, выкарыстанне фондаў фона- і відэатэкі, знаёмства са спецыяльнай літаратурай, наведванне філарманічных канцэртаў).

Для студэнта-інструменталіста істотным з'яўляецца разуменне правільнай арганізацыі ўсіх бакоў музычнага творчага працэсу, пачынаючы ад задумы да канкрэтнага ўвасаблення. Таму ў працэсе навучання самастойнай рабоце ўвага канцэнтруецца галоўным чынам на наступным:

– прадумванні вобразнага строю твора – магчымых асацыяцый, настрояў, народжаных імі думак;

– абдумванні матэрыяльнай тканіны твора – логікі развіцця падзей у гарманічнай будове твора, асаблівасцей мелодыі, рытму, фактуры, дынамікі, агогікі, формаўтварэння;

– пошуку дасканалых шляхоў, спосабаў і сродкаў увасаблення на інструменце думак і пачуццяў.

На думку многіх музыкантаў-педагогаў, у сучасным музычным навучанні даволі часта пераважае трэнаж прафесіянальна-іграевых здольнасцей вучняў. У выніку мізэрнасць ведаў музыкантаў пра музыку як галіну мастацтва вядзе да прафесіянальнай абмежаванасці музыкантаў-інструменталістаў, кругагляд якіх акрэслены вузкім колам іх непасрэднай спецыялізацыі. Перагружанасць вучэбнага працэсу такімі заняткамі не пакідае часу на віды неабходнай для музыканта дзейнасці, як падбор мелодыі па слыху, транспанаванне, чытанне з нотнага ліста, ігра ў ансамблі, імправізацыя.

Расшырэнне музычнага і агульнага інтэлектуальнага кругагляду павінна быць пастаянным клопатам як выкладчыка, так і студэнта. Звернемся да аўтарытэта Г.Г. Нейгаўза, які сцвярджаў, што "навучанне, асабліва ў мастацтве, ёсць адзін з відаў пазнання жыцця і свету і ўздзеяння на яго".

Штуршком для ўключэння працэсаў пазнання найперш аказваецца праблемная сітуацыя, у аснове якой ляжыць супярэчнасць, што праяўляецца ў неадпаведнасці паміж наяўнымі ведамі і новымі патрабаваннямі. Вырашэнне падобнай сітуацыі патрабуе адпаведных навыкаў. Для іх развіцця мы рэкамендуем наступныя віды практычных заняткаў:

– выявіць у творы яго ідэю, вядучую інтанацыю;

– вызначыць на слых стылявы кірунак музычнага твора;

– выявіць асаблівасці выканальніцкага стылю пры інтэрпрэтацыі рознымі музыкантамі аднаго і таго ж твора;

– вызначыць на слых гарманічныя паслядоўнасці;

– падабраць да музычнага твора ў адпаведнасці з яго вобразным строем творы літаратуры і жывапісу;

– параўнаць выканальніцкія планы музычнага твора ў іх розных рэдакцыях;

– знайсці ў музычным творы вядучыя інтанацыі і апорныя пункты, адпаведна якім развіваецца музычная думка;

– скласці некалькі выканальніцкіх планаў аднаго і таго ж музычнага твора;

– выканаць твор з рознай аркестроўкай.

Пры выкананні праблемных заданняў карысныя дыскусіі і абмеркаванні, якія прымушаюць студэнтаў дакладна фармуляваць сваю думку, пазіцыю, рабіць неабходныя вывады.

Музычны твор у рэальным гучанні існуе ў незлічонай колькасці разнастайных выканальніцкіх трактовак. Стымуляванне педагогам варыятыўнага падыходу пры вывучэнні музычнага твора, будовы некалькіх выканальніцкіх планаў аднаго і таго ж твора вядзе да фарміравання ў студэнта багатага творчага ўяўлення, павышае мастацкую выразнасць выканальніцкай ігры.

Такім чынам, самастойнае вырашэнне студэнтамі розных выканальніцкіх задач не толькі патрабуе набыцця адпаведных уменняў, навыкаў, самакантролю, самадысцыпліны, але і кіравання, дапамогі педагога, сумесных з ім творчых пошукаў.

**В.М. Валатковіч,** *дацэнт*

## РОЛЯ РЭЙТЫНГАВАЙ СІСТЭМЫ КАНТРОЛЮ Ў ВУЧЭБНЫМ ПРАЦЭСЕ
(факультэт музычнага мастацтва)

Выкарыстанне рэйтынгавай сістэмы кантролю вучэбнай работы студэнтаў дазваляе павысіць узровень арганізаванасці навучальнага працэсу, палепшыць навукова-метадычную дзейнасць выкладчыкаў, устанавіць эфектыўную зваротную сувязь студэнтаў, выкладчыкаў, дэканата і кафедраў. Бягучыя рэйтынгі садзейнічаюць актывізацыі вучэбнай дзейнасці студэнтаў, атрыманню кафедрамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ